# БЕЛАРУСКАЯ - САМАЯ МАЯ!

***ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЛІСТОК №4***

*Год снежнем канчаецца, зіма пачынаецца.*

## *Узоры беларускай душы*

Многія з нас хацелі б пачуць галасы сваіх продкаў, даведацца, пра што думалі, аб чым марылі ў старажытнасці пакаленні беларусаў, што яны любілі, чаго баяліся, каго паважалі і што хацелі б расказаць нам, сваім нашчадкам. Гэта магчыма дзякуючы старадаўнім тканым і вышываным вырабам, якія захаваліся да нашага часу. Калі ўважліва прыгледзецца да чароўных узораў, то ў іх шмат чаго можна “прачытаць”. Арнамент – гэта своеасаблівая кніга народнай мудрасці. У пасланнях нашых продкаў сканцэтраваны просьбы, мары, надзеі, добрыя пажаданні родным і блізкім, адчуванні шчасця ці смутку і многае іншае.



Сімвалізуе любоўную песню

У кожным вытканым сантыметры тканіны, у кожным шыўку ўзору быў заключаны глыбокі сэнс. У старажытныя часы лічылі, што арнамент ахоўваў ад ліха, быў зваротам да багоў, каб яны спрыялі ў жыцці, немясцовым распавядаў аб тым, якія людзі жывуць у той ці іншай мясцовасці і якая сістэма ўяўленняў пра свет пануе ў іх, ды ўвогуле дазваляў беларусам “выдзяляцца” сярод іншых народаў. Беларускія тканіны маюць пераважна рытуальныя і эстэтычныя функцыі. У сваім дэкоры яны змяшчаюць адмысловую знакавую сістэму. Народнае ткацтва – бяздонная крыніца культурна-гістарычных звестак. Што ні ўзор – то сімвал. Усе іх не пералічыць, але кожны ўзор мае сваё прызначэнне і назву. Яны могуць сімвалізаваць дабро і прыгажосць, даваць надзею і сілы, выказваць гонар за чалавека і яго працу, увасабляць любоў і павагу да сваіх продкаў і роднай зямлі.



Сімвал маці



Маці і святое дрэва

Ткацтва – найбольш развітая галіна народнай творчасці ў Беларусі. Спрадвеку майстрыцы аздаблялі тканымі ўзорамі адзенне, сурвэткі, фіранкі, навалачкі, абрусы, посцілкі, дываны, ходнікі. У Беларусі незвычайна багатая спадчына ўзораў народнага арнаменту.

Мастацкія вырабы радуюць сваёй прыгажосцю. Эстэтычныя пачуцці былі ўласцівыя яшчэ нашаму далёкаму прашчуру. Як сведчаць археалагічныя раскопкі, ён не толькі ствараў утылітарныя, патрэбныя ў побыце рэчы, але і ўпрыгожваў іх узорамі. Вырабы, створаныя народнымі майстрамі, увасабляюць у сабе вельмі багатыя традыцыі арнаментальнага мастацтва.



Сімвал дужай сям'і

Беларускі ручнік адносіцца да тых прадметаў народнага мастацтва, якія належаць і мінуламу, і сучаснасці. У побыце беларусаў ручнік прысутнічаў не адно стагоддзе. Ткуць і расшываюць яго і сёння, працягваючы ўдасканальваць прыгажосць, над якой працавала мноства папярэдніх пакаленняў. Папулярнасць ручніка нязменная, патрэба ў ім адчуваецца і ў нашы дні. Па-ранейшаму ён суправаджае чалавека ў найбольш важныя, пераломныя этапы яго жыццёвага шляху.



Сімвал жаночай долі

Без традыцыйнага ручніка не абыходзяцца зараз і выставы народнага мастацтва, бо менавіта ручнік з найбольшай яркасцю ўвасабляе нацыянальныя рысы арнаментальнага мастацтва, высокае майстэрства ткацтва і вышыўкі.



Сімвал абярэгу

Сапраўдным гонарам Беларусі, сусветнапрызнаным дасягненнем яе шматвяковай культуры з’яўляюцца слуцкія паясы. Вырабы ткацкай мануфактуры, якая працавала ў Слуцку ў другой палове XVIII – пачатку XIX стагоддзя, па праву лічацца найбуйнейшым здабыткам айчыннага і еўрапейскага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.



Сімвал сонца

Дзякуючы таленту і працы беларускіх ткачоў, склаўся характэрны від пояса, які атрымаў сусветную славу як слуцкі. Важным дасягненнем слуцкіх майстроў стала выкарыстанне ўнікальнай тэхнікі ткацтва, якая дазволіла ствараць чатырохбаковыя паясы з багатай арнаментацыяй і каляровай гамай з перавагай залаціста-жоўтых, аранжавых, ружовых, блакітных, зялёных, карычневых і чырвоных тонаў. Аўтараў малюнкаў узораў і арнаментаў натхнялі матывы квітнеючай роднай прыроды – блізкія іх сэрцу васількі, незабудкі, ружы, гваздзікі, півоні, кветкі і лісты канюшыны, галінкі дубоў і бяроз.



Сімвал дзіцяці. Засцерагае дзяцей ад няшчасця

У сусветнай культуры слуцкія паясы маюць значэнне нацыянальнага сімвала Беларусі і ўвасобілі ў сабе мастацкі талент беларускага народа.